# МАЎЛЕНЧАЯ КУЛЬТУРА ВУЧНЯЎ: ЯК НАВУЧЫЦЬ ДАКЛАДНА ВЫКАЗВАЦЬ СВАЕ ДУМКІ

## Тыпалогія практыкаванняў і структура моўнай асобы



**М. Г. Яленскі,**
галоўны навуковы супрацоўнік лабараторыі гуманітарнай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі, доктар педагагічных навук

**В. І. Свірыдзенка,**
дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства БДПУ імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук



**Артыкул прысвечаны важнай праблеме сучаснай адукацыі – фарміраванню маўленчай культуры вучняў. У ім аналізуюцца розныя дэфініцыі тэрміна «культура маўлення», разглядаюцца адрозненні сумежных тэрмінаў «культура маўлення» і «маўленчая культура асобы», вызначаюцца арыенціры ў асваенні чалавекам роднага маўлення і адпаведныя кампаненты культуры маўлення.**

**Аўтары апісваюць сродкі фарміравання маўленчай культуры асобы вучня, спыняюцца на практыкаваннях як найбольш пашыраным спосабе развіцця маўленчай культуры навучэнцаў і адзначаюць, што сістэма практыкаванняў павінна суадносіцца са структурай моўнай асобы. У артыкуле раскрываецца сутнасць кагнітыўных (моўных), лексіка-граматычных, матывацыйна-прагматычных (маўленча-камунікатыўных), сацыяльна-псіхалагічных і каштоўнасна-сэнсавых практыкаванняў, указваецца, якія кампаненты культуры маўлення асвойваюцца пры іх выкананні, вызначаецца пералік дыдактычных патрабаванняў, якім павінны адпавядаць названыя тыпы практыкаванняў.**

Праблема культуры маўлення была, ёсць і будзе актуальнай у шырокім сацыяльным кантэксце. Уменне дакладна і ясна выказваюць свае думкі, гаварыць правільна, прыцягваць увагу іншых сваім маўленнем – своеасаблівая характарыстыка прафесійнай прыдатнасці дыпламатаў, юрыстаў, палітыкаў, выкладчыкаў, журналістаў, работнікаў радыё і тэлебачання, менеджараў і іншых спецыялістаў.

Тэрмін «культура маўлення» мае розныя дэфініцыі ў лінгвістыцы і ў лінгвадыдактыцы. Так, лінгвіст Я. М. Шыраеў вызначае культуру маўлення, па-першае, як «валоданне нормамі літаратурнай мовы ў яе вуснай і пісьмовай форме, пры якой ажыццяўляецца выбар і арганізацыя моўных сродкаў, што дазваляюць у пэўнай сітуацыі зносін і пры захаванні этыкі зносін забяспечыць найбольшы эфект у дасягненні пастаўленых задач камунікацыі», па-другое, як галіну мовазнаўства, якая «займаецца праблемамі нармалізацыі маўлення і распрацоўвае рэкамендацыі па ўмелым карыстанні мовай» [2, с. 287].

Т. В. Мацвеева дае азначэнне культуры маўлення як сферы духоўнай культуры, звязанай з выкарыстаннем мовы. Гэта «якасці маўлення, якія забяспечваюць эфектыўнае дасягненне мэты зносін пры захаванні моўных правіл, этычных норм, сітуацыйных патрабаванняў



і эстэтычных установак». Яна падкрэслівае, што «ў культуры маўлення злучаецца мова і грамадскі вопыт прымянення мовы» [4, с. 121].

Вядомы расійскі метадыст М. Р. Львоў гаворыць пра культуру маўлення (маўленчую культуру) як пра «валоданне нормамі вуснай і пісьмовай літаратурнай мовы (арфаэпія, націск, выкарыстанне слоў, арфаграфія, марфалогія, сінтаксіс), а таксама ўменне выкарыстоўваць вобразна-выяўленчыя магчымасці мовы ў адпаведнасці з мэтамі выказвання, з камунікатыўнай мэтазгоднасцю, з умовамі зносін» [3, с. 96–97]. Ён вылучае дзве ступені культуры маўлення: правільнасць, нарматыўнасць маўлення; майстэрства, уменне выбраць найбольш дакладны па значэнні, стылістычна мэтазгодны, выразны, яркі варыянт выказвання [3]. Па словах М. Р. Львова, «культура маўлення можа быць дасягнута толькі на аснове агульнай культуры суб'екта і яго акружэння, любові да роднай мовы, высокай культуры мыслення» [3, с. 97].

Пры ўсёй разнастайнасці дэфініцый можна заўважыць, што ў аснове паняцця «культура маўлення» ляжыць паняцце нарматыўнасці. Пры гэтым Т. В. Мацвеева адзначае, што «ў тэрміне *культура маўлення* падкрэсліваецца падыход з боку аб'екта: культура (чаго?) маўлення. Пры неабходнасці падкрэсліць падыход з боку чалавека, носьбіта культуры прынята выкарыстоўваць сумежны тэрмін *маўленчая культура* (чыя?) *асобы*. У гэтым выпадку абмяркоўваецца камунікатыўная кампетэнцыя асобнага чалавека або групы асоб» [4, с. 123].

Пры асваеннні культуры роднага маўлення чалавек мае чатыры важныя арыенціры: 1) сукупнасць норм літаратурнай мовы, 2) сукупнасць этычных установак свайго народа, 3) сукупнасць мэт і абставін зносін, 4) нацыянальнае ўяўленне пра прыгажосць маўлення. Адпаведна вылучаюцца моўны, этычны, камунікатыўны і эстэтычны кампаненты культуры маўлення [4].

Узрастанне цікавасці грамадства да культурных традыцый, неабходнасць перадачы каштоўнасных арыенціраў падрастаючаму пакаленню патрабуе новых падыходаў да вырашэння пытання фарміравання маўленчай культуры навучэнцаў I – III ступеней агульнай сярэдняй адукацыі.

Фарміраванне маўленчай культуры асобы вучня ажыццяўляецца за кошт адпаведных педагагічных сродкаў. Да іх ліку адносіцца як сам вучэбны матэрыял (тэарэтычны і практычны), так і метады навучання, спосабы дзейнасці, якімі павінны авалодаць вучні для фарміравання ўменняў і навыкаў. Адным з найбольш пашыраных спосабаў развіцця маўленчай культуры навучэнцаў з'яўляюцца практыкаванні.

**Практыкаванні ў лінгваметодыцы** разглядаюцца, з аднаго боку, як метад навучання, а з другога – як шматразовае мэтанакіраванае выкананне вучнямі пэўных дзеянняў і аперацый у розных умовах і ўзаемасувязях са зместам вывучаемага з мэтай практычнага засваення імі тэарэтычнага матэрыялу – фарміравання моўных і маўленча-камунікатыўных уменняў і навыкаў, спосабаў дзейнасці (аналітычнай, аналітыка-сінтэтычнай, творчай).

**Класіфікацыя практыкаванняў**, накіраваных на развіццё маўленчай культуры навучэнцаў, ажыццяўляецца ў залежнасці ад:

- *спосабаў дзейнасці* (практыкаванні на распазнаванне моўных з'яў, запамінанне, дыферэнцыяцыю, класіфікацыю, абагульненне, супастаўленне і інш.);
- *мэты* (практыкаванні моўныя і маўленча-камунікатыўныя, рэцэптыўныя, рэпрадуктыўныя і творчыя (крэатыўныя), аспектныя і комплексныя, трэніровачныя і кантрольныя і інш.);
- *спосабу выканання* (практыкаванні вусныя і пісьмовыя, аднамоўныя і двухмоўныя, індывідуальныя і калектыўна-групавыя і інш.);
- *тыпу маўленчай дзейнасці* (практыкаванні на аўдзіраванне, гаварэнне, чытанне, пісьмо);
- *аспекта мовы* (практыкаванні фанетычныя, лексічныя, граматычныя (марфемныя, словаўтваральныя, марфалагічныя, сінтаксічныя), арфаграфічныя, пунктуацыйныя, стылістычныя);
- *тэкставай ідэнтыфікацыі* (практыкаванні тэкставыя, перадтэкставыя, паслятэкставыя).

Зразумела, што эфектыўнасць вучэбнай дзейнасці навучэнцаў дасягаецца за кошт выкарыстання ***сістэмы практыкаванняў*** – «сукупнасці тыпаў, родаў і відаў практыкаванняў, аб'яднаных па прызначэнні, матэрыяле і спосабе іх выканання» [7, с. 302].

Сістэма практыкаванняў, скіраваных на развіццё маўленчай культуры навучэнцаў, павінна суадносіцца са структурай моўнай асобы, што складаецца з наступных кампанентаў: кагнітыўнага, лексіка-граматычнага, матывацыйна-прагматычнага, сацыяльна-псіхалагічнага, каштоўнасна-сэнсавага. Адпаведна **тыпалогія практыкаванняў**, арыентаваных на фарміраванне маўленчай культуры вучня сродкамі беларускай мовы, павінна быць наступнай:

- кагнітыўныя (моўныя) практыкаванні, звязаныя з фарміраваннем моўнай свядомасці, культуры мыслення асобы;
- лексіка-граматычныя практыкаванні, звязаныя з засваеннем літаратурных норм і выпрацоўкай адпаведных лексічных, марфалагічных, сінтаксічных, арфаграфічных, пунктуацыйных уменняў і навыкаў;
- матывацыйна-прагматычныя (маўленча-камунікатыўныя) практыкаванні, звязаныя з авалоданнем вучнямі разнастайнымі відамі маўленчай дзейнасці;
- сацыяльна-псіхалагічныя і каштоўнасна-сэнсавыя практыкаванні, звязаныя з фарміраваннем сацыяльна-псіхалагічнай культуры моўнага суіснавання (культуры моўнага ўчынку).

**Кагнітыўныя (моўныя) практыкаванні** звычайна прадугледжваюць аналітыка-сінтэтычную дзейнасць з моўнымі аб'ектамі, іх асэнсаванне на тэарэтыка-паняційным узроўні. Яны складаныя па сваім характары. Напрыклад, пагукавая фанетычная характарыстыка слова (фанетычны разбор) не такая лёгкая для навучэнцаў, таму што выконваецца на аснове вусна ўспрынятага (а не напісанага!) слова. Не прывучаныя аналізаваць жывое слова (без зрокавага ўспрымання), вучні дапускаюць шматлікія памылкі. Практыкаванні, арыентаваныя на фанетычны аналіз, забяспечваюць усведамленне навучэнцамі элементаў гукавой сістэмы беларускай мовы, развіваюць абстрактнае мысленне і ствараюць надзейную базу для авалодання граматным пісьмом.

Практыкаванні, арыентаваныя на лінгвістычны (шматаспектны) аналіз тэксту, выкарыстоўваюцца ў старшых класах для абагульнення і сістэматызацыі ведаў. У працэсе лінгвістычнага аналізу выяўляюцца асаблівасці самога тэксту (тып, жанр, структура, стыль і інш.), асобных сінтаксічных канструкцый, даецца характарыстыка арфаграм і пунктаграм.

Практыкаванні на граматычнае мадэляванне (складанне марфемнай ці словаўтваральнай мадэлі слова, сінтаксічнай ці пунктуацыйнай мадэлі сказа) таксама адносяцца да кагнітыўных. Мадэляванне дазваляе акцэнтаваць увагу вучняў на асноўных элементах граматычных з'яў з дапамогай спецыяльных графічных схем, якія ілюструюць марфемную будову слова ці сінтаксічную структуру сказа.

**Лексіка-граматычныя практыкаванні** падзяляюцца на практыкаванні тэарэтыка-пазнавальнага характару і практыкаванні па выпрацоўцы ўменняў і навыкаў прымянення ведаў. Тэарэтыка-пазнавальныя практыкаванні прапануюцца ўслед за знаёмствам з граматычным паняццем і яго асэнсаваннем. «Асэнсаванне гэтых паняццяў, як і правіл, і азначэнняў, – пісаў А. В. Цекучоў, – адбываецца шляхам расчлянення і канкрэтызацыі іх у свядомасці вучняў, г.зн. праз вылучэнне асобных іх бакоў, прымет, з сукупнасці якіх і складаецца ўяўленне пра тую ці іншую граматычную з'яву» [6, с. 170]. Пры гэтым настаўнік павінен зыходзіць з логікі фармулявання моўных законаў: спачатку ўказваецца родавае паняцце, у адносінах да якога дадзенае азначэнне з'яўляецца відавым, а затым пералічваюцца істотныя, але ўжо больш прыватныя прыметы для абмежавання аб'ёму паняцця і яго ўдакладнення [6].

Дзейнасць па выкананні названых практыкаванняў звязана з граматычнай характарыстыкай моўных адзінак, вызначэннем іх функцыянальных магчымасцей, назіраннем за іх семантыкай, парадыгмай граматычных форм (скланенне, спражэнне) і факусіруецца на прымяненні лексіка-граматычных ведаў (утварэнне граматычных форм у адпаведнасці з літаратурнай нормай і іх ужыванне ў працэсе вуснага і пісьмовага маўлення, дарэчнасць слова- і формаўжывання ў тэксце, правільная перадача на пісьме). Пры выкананні кагнітыўных і лексіка-грамытычных практыкаванняў навучэнцы асвойваюць моўны кампанент культуры маўлення.

**Матывацыйна-прагматычныя (маўленча-камунікатыўныя) практыкаванні** заўсёды звязаны з тэкстам, які з'яўляецца альбо аб'ектам вывучэння (чытанне, слуханне тэксту, вызначэнне яго тыпу, стылю, структуры, жанравых асаблівасцей), альбо прадуктам вучэбнай дзейнасці (стварэнне тэкстаў пэўнага тыпу, стылю, жанру). Тэкстацэнтрычны прынцып навучання мове прадугледжвае, з аднаго боку, арганізацыю працы з моўнымі адзінкамі на аснове не ізаляваных слоў і сказаў, а тэксту, у складзе якога яны функцыянуюць у адпаведнасці са сваім прызначэннем; з другога боку, разгляд тэксту як прадмета вывучэння і адзінкі навучання маўленню (ад назірання над тэкстам, яго аналізу да стварэння тэксту). Пры выкананні матывацыйна-прагматычных практыкаванняў вучні асвойваюць моўны і камунікатыўны кампаненты культуры маўлення.

**Сацыяльна-псіхалагічныя і каштоўнасна-сэнсавыя практыкаванні** звязаны з фарміраваннем культуры суразмоўніцтва, засваеннем маўленчай этыкі, перцэптыўных і эмацыянальна-экспрэсіўных здольнасцей, пазітыўных установак на выяўленне сэнсу і асобасных пазіцый суразмоўцы. Яны не

абмяжоўваюцца вывучэннем канкрэтных тэм моўнага курса, а носяць імпліцытны характар і выкарыстоўваюцца на любым уроку. Згаданы тып практыкаванняў да месца тады, калі важна засяродзіць увагу на асаблівасцях маўлення пры фіксацыі адступлення ад нормы (у тым ліку этычнай) ці наадварот: пры прэзентацыі правільнасці маўлення, арганізацыі камунікатыўнай дзейнасці ў спецыяльна створанай маўленчай сітуацыі з мэтай засваення норм сацыяльна-бытавой, міжасобаснай камунікатыўнай культуры. Па сутнасці, такія практыкаванні скіраваны на аваладанне вучнямі сацыяльна-псіхалагічнай культурай моўнага суіснавання грамадзян у социуме: як правільна звярнуцца з пытаннем да суразмоўцы, уступіць у дыскусію, выказаць нязгоду з пазіцыяй суразмоўцы, годна прэзентаваць уласную пазіцыю, выступіць з прывітальным ці віншавальным словам, выказаць спачуванне, адрэагаваць на неадэкватныя паводзіны асобных грамадзян і г.д.

Дадзены тып практыкаванняў можа і не быць прадугледжаны школьным зместам адукацыі, рэалізаваным у падручніку. Аднак тое, што культуры моўных паводзін трэба вучыць, нікім не аспрэчваецца. Такая праца можа ажыццяўляцца як адвольна, так і падчас выканання спецыяльных маўленча-камунікатыўных практыкаванняў. У апошнім выпадку трэба абавязкова абапірацца на вучэбныя сітуацыі, максімальна набліжаныя да рэальнасці. Пры выкананні сацыяльна-псіхалагічных і каштоўнасна-сэнсавых практыкаванняў навучэнцы асвойваюць этычны і эстэтычны кампаненты культуры маўлення.

Кожны з тыпаў практыкаванняў, які падпарадкаваны асноўнай дыдактычнай мэце ўрока, павінен мець «пастаянную прапіску» на вучэбных занятках: без кагнітыўных практыкаванняў немагчыма засвоіць моўную тэорыю, без лексіка-граматычных – сфарміраваць на аснове тэорыі практычныя ўменні і навыкі, без матывацыйна-прагматычных – авалодаць навыкамі маўленчай дзейнасці па выкарыстанні моўных адзінак, без сацыяльна-псіхалагічных і каштоўнасна-сэнсавых – засвоіць сацыяльна-псіхалагічныя нормы паводзін і ўзаемаадносін у адпаведнасці з этычным і моўна-эстэтычным ідэалам.

Практыкаванні, скіраваныя на развіццё маўленчай культуры асобы навучэнца сродкамі беларускай мовы, павінны адпавядаць наступным дыдактычным патрабаванням:

- ❑ усвядомленасць вучэбнай дзейнасці (вучань павінен разумець, з якім тэарэтычным матэрыялам суадносіцца практыкаванне, з якой мэтай і якім чынам яго неабходна выконваць);
- ❑ паступовасць і паслядоўнасць выканання (у адпаведнасці з узроўнямі засваення матэрыялу па 10-бальнай сістэме ацэньвання) [5; 8];
- ❑ тыпалагічная разнастайнасць (практыкаванні розных тыпаў, якія актуалізуюць розныя віды дзейнасці; варыятыўнасць практыкаванняў аднаго тыпу);
- ❑ колькасная дастатковасць;
- ❑ крэатыўнасць (мэтазгодна выкарыстоўваць практыкаванні, скіраваныя не на засваенне ведаў як абсалютнай ісціны, а на іх пошук праз выяўленне супярэчнасцей, прыкладаў адступленняў ад нормы).

Апошняе патрабаванне мы лічым асабліва важным: паводле заўвагі вядомага расійскага філосафа Э. В. Ільенкава, школа павінна вучыць думаць, а не засвойваць гатовыя веды. А таму навучанне, заснаванае на фармальным выкананні рэпрадуктыўных практыкаванняў, вучоны назваў «самым «надзейным» спосабам нявечання мозгу і інтэлекту» [1, с. 158], паколькі дзейнасць па штампе, па гатовых рэцэптах не развівае мыслення.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Ильенков, Э. В.** Об идолах и идеалах / Э. В. Ильенков. – М.: Политиздат, 1968. – 319 с.
2. **Культура русской речн** / под ред. Е. Н. Ширяева, Л. Ю. Нванова, А. П. Сковородникова. – 2-е изд., испр. – М.: Флинта: Наука, 2007. – 431 с.
3. **Львов, М. Р.** Словарь-справочник по методике русского языка / М. Р. Львов. – 2-е изд., испр. и доп. – М.: РОСТ: Фнрма «Скрин», 1997. – 255 с.
4. **Матвеева, Т. В.** Русский язык, культура речи, стилистика, риторнка / Т. В. Матвеева. – М.: Флинта: Наука, 2003. – 837 с.
5. **Подласый, И. П.** Педагогика: учебник / И. П. Подласый. – М.: Высшее образование, 2006. – 540 с.
6. **Текучев, А. В.** Методика русского языка в средней школе: учебиик для пед. нн-тов по спец. 2101 «Рус. яз. и лит.» / А. В. Текучев. – М.: Просвещение, 1980. – 414 с.
7. **Щукнн, А. И.** Лингводидактический энциклопедический словарь: более 2000 единиц / А. Н. Щукин. – М.: Астрель [и др.], 2008. – 746 с.
8. **Яленскі, М. Г.** Методыка выкладання беларускай мовы. Сучасная лінгвадыдактыка: вучэб. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей установ, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М. Г. Яленскі. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2005. – 224 с.